Установа адукацыі
«Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна»
Гістарычны факультэт
Студэнцкае навуковае таварыства

# МОЛАДЗЬ БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ

Зборнік навуковых прац маладых даследчыкаў

*Заснаваны ў 1996 годзе*

**Выпуск 11**

**Брэст**
**«Альтернатива»**
**2023**

УДК 94(476.7)(082)

Чарговы зборнік, падрыхтаваны Студэнцкім навуковым таварыствам, змяшчае вынікі даследчай працы маладых гісторыкаў, якія закранаюць разнастайныя праблемы археалогіі, этналогіі, айчыннай і сусветнай гісторыі і культуры.

Адрасуецца ўсім, хто цікавіцца гісторыяй, вучням, студэнтам, настаўнікам, выкладчыкам.

Рэдакцыйная рада:
*А. М. Вабішчэвіч* доктар гістарычных навук, прафесар;
*А. А. Бурык* кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*А. І. Пашковіч* кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*А. А. Ігнацюк* старшыня Студэнцкага навуковага таварыства

Рэцэнзенты:
*С. А. Піваварчык,* доктар гістарычных навук, дацэнт
(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы);
*А. В. Машчук,* кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(Брэсцкі абласны інстытут развіцця адукацыі)

*Тэксты апублікаваныя ў аўтарскай рэдакцыі. За змест і дакладнасць інфармацыі адказнасць нясуць аўтары.*

**ISBN 978-985-521-804-4**

© УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна», 2023
© Афармленне. ПВГУП «Издательство Альтернатива», 2023

# ЗМЕСТ

## АРХЕАЛОГІЯ

**Дацкевіч А. А.** Гісторыя археалагічнага вывучэння старажытнага Берасця ....................5

**Граф В. И.** Детские туфли полочан XII–XIII вв. ....................10

**Федорук Д. А.** Стеклянная тарная посуда с археологических исследований на ул. Советских пограничников в г. Бресте (предварительный анализ) ....................15

**Кузьмич А. В**. История библейской археологии в XIX веке ....................25

## ЭТНАЛОГІЯ. АНТРАПАЛОГІЯ

**Селях А. А.** Удзел дзяўчат у абрадавым жыцці заходнепалескай вёскі ў XIX – першай палове XX ст. ....................32

**Ігнацюк А. А.** Заходнепалеская сялянская хата кан. 1930-х – пач. 1950-х гг. праз прызму вуснай гісторыі (на прыкладзе в. Балоты Кобрынскага раёна) ....................39

**Овсеенко Т. С.** Детская повседневность и традиции воспитания в социокультурном пространстве сельской семьи на Брестчине: историографический обзор ....................45

**Ігнацюк Т. А.** Каляндарная абраднасць сяла на Кобрыншчыне ў 30-я гг. XX ст. – пачатку XXI ст.: траснфармацыя традыцый святкавання Шчодрага вечара ....................54

## ГІСТОРЫЯ

**Гавриленко К. Е.** Бужские голендры и «голландское право» в социальной истории Брестчины ....................65

**Казмерчук М. А.** Отражение событий гражданской войны в России в массовой культуре (на примере компьютерной игры Battlefield 1) ....................69

**Чернякевич С. М.** Кризис в деятельности украинского общества «Просвита на Полесье» в конце 1920-х гг. ....................74

**Пяцінкін К. П.** Беларусізацыя Аб'яднанай Беларускай вайсковай школы ў 1920-я гг. ....................82

**Горанина А. Д.** Социально-экономическое развитие города Пружаны (1921–1939 гг.) ....................89

**Сарапин А. А.** Демографические изменения социальной группы «восточников» в городе Бресте 1939–1945 гг. ..............................................95

**Гаўрылюк П. А.** Эвалюцыя школьнай адукацыі ў горадзе Брэсце ў 1939–1953 гг. ..............................................................................101

**Куликович Д. А.** Причины роста преступности в первые послевоенные годы на территории СССР (1945–1953) гг. ..........................106

## МІЖНАРОДНЫЯ АДНОСІНЫ. ПАЛІТАЛОГІЯ

**Качановская О. О.** Развитие межгосударственных отношений Республики Беларусь с арабскими странами ...............................................116

**Шедько Е. А.** Деятельность Республики Беларусь в рамках Организации договора о коллективной безопасности .................................125

**Семченко А. К.** Этапы «мифологизации» украинской истории в XIX–XX вв. с позиций концепции сепаратизма .......................................131

## МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ

**Свентуховская Г. В.** Формирование функциональной грамотности у будущих учителей обществоведения ........................................................139

## ПАМЯЦІ ВУЧОНАГА

**Черевко В. В.** Памяти профессора Ольги Николаевны Левко ..................153

## ЭТНАЛОГІЯ. АНТРАПАЛОГІЯ

УДК 39-055.2(476-22)(091)“18/19”

**А. А . Селях** (БДУ)

*Навуковы кіраўнік: Т. А. Навагродскі, доктар гістарычных навук, прафесар*

# УДЗЕЛ ДЗЯЎЧАТ У АБРАДАВЫМ ЖЫЦЦІ ЗАХОДНЕПАЛЕСКАЙ ВЁСКІ У XIX – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XX ст.

*Артыкул прысвечаны разгляду месца і ролі дзяўчат у абрадавым жыцці традыцыйнай вёскі. Вылучаны перыяды ў гадавой каляндарнай абраднасці, для якіх характэрна найбольшая актыўнасць дзяўчат. Падкрэсліваецца асаблівы статус незамужніх дзяўчат у сацыяльнай структуры вясковай грамады. Геаграфічна даследаванне ахоплівае гісторыка-этнаграфічны рэгіён Заходняе Палессе. Праблема асэнсоўваецца праз прызму ўспамінаў жаночага насельніцтва, сабраных аўтарам у сельскіх мясцовасцях Берасцейшчыны.*

Традыцыйная каляндарная абраднасць беларусаў, асобныя элементы якой у мадыфікаваным выглядзе захаваліся сёння, усебакова даследавана ў працах айчынных навукоўцаў Т. В. Валодзінай, Т. І. Кухаронак, А. С. Ліса, Т. І. Шамякінай і іншых. Агульнай для дследчыкаў з’яўляецца наступная выснова: каляндарная абраднасць – гэта не проста спосаб святкавання альбо адпачынку, яна з’яўляецца адной з формаў кансалідацыі сельскай супольнасці, у чым заключаецца яе найбольш значная сацыяльная функцыя. Асаблівасць кожнай традыцыйнай культуры заключаецца ў тым, што яна ўяўляе сабой духоўнае аблічча народа: яго сацыякультурны вопыт, маральна-этычныя ідэалы, ментальнасць, творчыя патэнцыі [8, с. 3]. Каляндарна-абрадавая творчасць суправаджала чалавека ў яго паўсядзённым жыцці, арыентавала яго ў практыцы адносін з людзьмі і навакольным светам.

Вядома, што ў беларускім сельскім грамадстве здаўна існавала полаўзроставая стратыфікацыя, якая мела праяву ва ўсіх баках штодзённага жыцця: досугавых практыках, матэрыяльнай культуры, працоўных абавязках, абрадавых ролях. Разумеючы логіку традыцыйнага соцыума, дзе кожны чалавек займаў пэўнае месца ў сістэме грамадскіх і сямейных дачыненняў, цікава пазнаёміцца з колам абрададзеянняў, якія выконваліся дзяўчатамі. На працягу каляндарнага года назіраўся актыўны ўдзел моладзі ў рытуальна-абрадавых практыках. Дзяўчаты мелі асаблівы статус у грамадскім жыцці

вёскі. Дасягнуўшы адпаведнага ўзросту, дзяўчаты адлучаліся ад бацькоўскай хаты і групаваліся ў дзявочай супольнасці і супольнасці хлопцаў. На этапе сталення адбывалася не проста інтэграцыя дзяўчат у моладзевую супольнасць, але і ў сельскі соцыум. Пры гэтым важнай умовай удзелу ў шэрагу абрадавых дзеянняў быў незамужні статус дзяўчыны. Паколькі для замужніх альбо цяжарных жанчын кола культурных практык значна звужалася, амаль усё сацыяльнае зыходзіла ў цень. Гэта падкрэсліваецца ў тэкстах музычальна-фальклорных запісаў, зафіксаваных у Столінскім раёне [1, л. 42]:

"*Пойце, дзеўкі, як поецца,*
*Пойдзеш замуж,*
*Усё ж мінецца.*
*Пойдзеш замуж,*
*Бабой будзеш.*
*Усе прыпевушкі забудзеш*".

Можна вылучыць некалькі перыядаў у гадавой каляндарнай абраднасці, якім была ўласціва тая ці іншая ступень актыўнасці моладзі, у прыватнасці дзяўчат. Найбольш насычаным абрадамі і святамі быў вяснова-летні перыяд. Пасля мясаеду, перад постам, на Масленічным тыдні, паўсюль у розных рэгіёнах Беларусі пачыналі "гукаць вясну" [2, с. 59]. "Калі з'яўляліся першыя праталіны, – адзначыла Т. І. Шамякіна, – дзяўчаты і маладзіцы звычайна ішлі у лес, даставалі з-пад снегу барвянок і плялі сабе вянкі, якія ўпрыгожвалі кветкамі, ягадамі, пераплятралі каснічкамі і надзявалі на галовы. Потым яны вадзілі карагод і спявалі веснавыя песні" [13, с. 63]. На Берасцейшчыне сустракаліся розныя варыяцыі назваў песен-вяснянак: на Піншчыне – *вородалкі*, Драгічыншчыне – *бородайкі,* Кобрыншчыне – *городалы*, Століншчыне – *конопелькі*. Пры гэтым існавалі спецыфічныя для асобных вёсак аднаго раёна мясцовыя назвы. Напрыклад, на памежжы Кобрынскага раёна з Украінай вяснянкі мелі назву *рогулыкі*. Яны выконваліся моладдзю падчас ваджэння карагода – *рогулыці*. Незамужнія дзяўчаты звярталіся з просьбай да замужняй маладзіцы, каб яна выйшла і развяла ім карагод:

"*Ой, мулудая мулодыцэ.*
*Ой, выйдэ, выйдэ на улыцю.*
*Розвэдэ дывкам рогулыцю*" (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з І. Р. Жук, 1943 г. н., аг. Дзівін, Кобрынскі р-н, 2017).

Большасць вясновых карагодных тэкстаў былі прасякнуты любоўна-шлюбнай тэматыкай. Тэма шлюбу была ўласціва практычна для ўсіх аграрна-гаспадарчых каляндарных абрадаў. Шлюб, сям'я, нараджэнне дзяцей – гэта ўстойлівыя матывы абрадавай паэзіі гадавога кола беларускай, у тым ліку,

заходнепалескай абраднасці [4, с. 59]. Гэта відаць з песеннага фальклору Кобрыншчыны:

“*На улыцэ дывучок радучок.*

*Пумэж імэ ны удного хлопця.*

*Прудай, матэ, рышэто клочча.*

*Купэ, матэ, дывойкам хлопця”* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з І. Р. Жук, 1943 г. н., аг. Дзівін, Кобрынскі р-н, 2017);

“*Ой, дай, Божэ, полю літа встрічаты,*

*А нам дывочкам жыніхів шукатэ.*

*Ой, дай, Божа, полю хліб родэтэ,*

*А нам дывочкам сто літ прожэтэ”* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з А. І. Шапяцюк, 1947 г. н., в. Лелікава, Кобрынскі р-н, 2018).

Завяршэнне веснавога і пачатак летняга цыклу каляндарных святаў суправаджаліся траецкай абраднасцю. Яркім рэгіянальным адрозненнем траецкага святкавання ў Заходнім Палессі з’яўляўся абрад “Ваджэнне куста” [12, с. 138]. Ён быў звязаны з культам шанавання расліннасці. Сярод дзяўчат выбіралася прыгожая, высокая дзяўчына, якая ўяўляла сабой вобраз куста. Разам з галоўнай гераіняй астатнія дзяўчаты рабілі абыход па вёсцы, прыпяваючы. “Ваджэнне куста” было звязана з прадстаўленнем аб жыватворчай сіле зеляніны, куста, магчымасцяў дзяўчат паўплываць на павышэнне ўраджайнасці зямлі. Блізкі па семантыцы абрад зафіксаваны ў в. Лелікава на тэрыторыі Кобрынскага раёна. Тут ён атрымаў назву “Крэнька” і меў сваю спецыфіку. Паводле сведчанняў жыхароў, на Тройцу дзяўчаты плялі вянкі. Затым выбіралася маладая пара, якая вяла групу моладзі па вёсцы. З успамінаў:

*“На Троіцу собіралысь (на второй день), водэлэ крэньку. Вінка плалэ з одуванчіков, лотоса. І хлопцові і дівчыне вілэ вінка. І одівалэ. Вонэ ішлэ по-пэраді. А за імі всяйка молодёжь. З гармоняю шлэ, частушкэ и пісні співалэ”* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з А. І. Шапяцюк, 1947 г. н., в. Лелікава, Кобрынскі р-н, 2018).

Адна з найбольш вядомых песен “Ой, повадам крэньку”:

*“Ой, там у полі дывочкэ гулялэ.*

*Дывочкэ гулялэ, цвіточкэ рвалэ.*

*Цвіточкэ рвалэ, й вілэ віночкэ.*

*Вілэ й віночкэ крэньку водэлэ.*

*Ой, повадам крэньку за поцюрэньку”* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв’ю з А. І. Шапяцюк, 1947 г. н., в. Лелікава, Кобрынскі р-н, 2018).

Кульмінацыяй летняй абраднасці было Купалле. Дзяўчаты плялі вянкі і для сябе і для ўпрыгожвання калодзежаў, калаўротаў. Хлопцы шукалі найбольш зручны час для свавольстваў: *“Облывалы водой хлопцы. Бывала, у кровацях*

*спалы дзівчата, то прыдуць, оболлюць. Ужо пільнуемо, замыкаемось…"* [7, с. 369]. Падчас свята выконваліся купальскія песні.

Асаблівую ролю адыгрывалі незамужнія дзяўчаты падчас удзелу ў жніўных талоках. Зажынкам папярэджваў абрад "пакрыванне поля". Па выніках завяршэння жніва менавіта маладая дзяўчына падыходзіла з віншаваннем да гаспадара поля і даравала яму апошні сноп і вянок – сімвалы заканчэння працы. Не абыходзілася без спеву жніўных песень:

*"Котэвся віночок по полю,*
*Просэвся дывочак до дому:*
*"Ой, вітэ моі дывочкэ,*
*Возьміта мэнэ на ручкэ,*
*Занасіта до дому,*
*Положіта мэнэ у сторонку (у клуню)"* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з А. І. Шапяцюк, 1947 г. н., в. Лелікава, Кобрынскі р-н, 2018).

Звычай адорваць гаспадара поля быў апісаны яшчэ А. Кіркорам: "З усіх сельскіх заняткаў жніво – самая паважаная і любімая, – адзначаў даследчык.... – Сяляне, здзяйсняючы Дажынкі, звычайна выбіралі самую прыгожую дзяўчыну, якая з асістэнткамі і з усімі жніцамі адпраўляецца з песнямі ў панскі дом і ўручае ўладальніку вянок з жыта. Апошні дзякуе дзяўчыну і запрашае ўсіх тых, хто сабраўся павесяліцца" [6, с. 24]. Пасля працы дзяўчатам раілі качацца па полі, каб сваты хутчэй прыязджалі, і яны ў гэтым годзе выйшлі замуж [9, с. 53]. Да таго ж маладосць і цнатлівасць дзяўчыны павінны былі дабратворна паўплываць на ўраджай.

Зімой моладзь чакала Каляды. Напярэдадні Калядаў дзяўчаты варажылі. Распаўсюджанымі на Брэстчыне былі наступныя: варажба з пеўнем (*"Пшанэці насыпяць, кожная кучку. Чэй півань чью кучку найперёд зклюе, та перша замуж выйде"*), з чобатам (*"Сапогэ кідалэ, у яку сторону полэтыть, оттуда ждэ сватов"*), з дровамі (*"Дрова носэлэ в хату, шчэталэ, шоб до парэ було. То тая замуж выйде хутка"*), з прадметамі асабістага карыстання (*"Лягае спатэ, кладэ то грыбэньца пуд голову. Кто прыснецца – за того замуж"*). Варожбы пераважна насілі матрыманіяльны характар, былі арыентаваны на атрыманне ведаў адносна шлюбу. У Брэсцкім, Кобрынскім, Іванаўскім і Пружанскім раёнах мелі месца рытуальныя свавольствы моладзі на Шчодры вечар:

*"Зайдэмо до дядька, дрова развалымо, то санкі зацягнэмо на хату навэрх. Калітку ў дядка здымэм і схаваемо…"; "Одівалыся хто в шчо мог, шоб ны позналы, бо шалосты ўсякія робылы…"* [12, с. 42]; *"Девушки развлекались по-всякому. Вечером штаны наложат, капалюша дедового оденут, косы соберут і пойдуть по селу – кого-то напугают"* (Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з А. П. Лоневай, 1930 г. н., в. Нікольская, Маларыцкі р-н, 2015).

З успамінаў пра свавольствы моладзі Кобрынскага раёну [5, с. 498]: *"…На Шчодруху можно було робыты такую як бы шкоду. Завязувалы двэры сусідам і ворота знымалы, і пулінне роскыдалы по дворі, а то шэй комына заткнуть. А дэ булы дывкы на выданне, то хлопцы старались украсты подушкы, а батькы должны за гэто выкуп даты, шоб тыі подушкы назад вырнулы"*. Такога роду дзеянні адносілі да катэгорыі ахавальных і ачышчальных абрадаў ад злых духаў, нячыстай сілы [11, с. 12]. Па сваёй сутнасці бясчынствы насілі забаўляльны характар.

Калі браць пад увагу сямейную абраднасць, то найбольш актыўны ўдзел дзяўчаты прымалі падчас вяселля. Для паўнавартаснага правядзення вясельнага абраду патрэбны быў шэраг выканаўцаў традыцыйных роляў і функцый, якімі і надзялялася дзявочая супольнасць. Напярэдадні вяселля, на яго падрыхтоўчым этапе, праводзіўся абрад "Віночкі", які меў на Палессі наступныя лакальныя назвы: "Збірна субота", "Коровай", "Квіты", "Вэлён". У суботу нявеста хадзіла па сяброўках, збірала ў іх стужкі ("пудвычкы") для вясельнага вянка і запрашала да сябе на "вынкі". Дзяўчат павінна было быць да пары. Адна з сяброўак тры разы благаслаўляла нявесту, астатнія пад абрадавыя вясельныя песні рабілі кветкі. Тая, што благаслаўляла, віла вянок. Кветкі рабілі ўсім гасцям, сватам, маладому і маладой. Выкарыстоўвалі рознакаляровую паперу, ніткі, сухазлоціцу (фальгу), а на вянок маладой – зеляніну з барвінка, руты. Увечары прыходзіў жаніх, які "выкупляў" вянок, ставячы дзяўчатам гарэлку [10, с. 481]. Спяваліся жалобныя песні. Урывак песні з Піншчыны [14, с. 17]:

*"Ой, збурны дэнёк-нэділька,*
*Збырала дівонька дружэчкы,*
*Да й посажала ў лавочкы,*
*А сама сіла вышэй йіх,*
*Склоныла голоўку ныжэй йіх,*
*Покрыла зэмліцу коскамы,*
*Помыла ножэнькы слёзкамы"*

Падобную па сэнсу песню спявалі ў Жабінкаўскім раёне [1, л. 45]:

*"Збірная й субота й настала,*
*Танночка й подружкі збірала,*
*І садовыла радамі,*
*За тысовымі столамі,*
*І сама сыла між імі.*
*Спустыла очэнькі до зэмлі,*
*Поклала ручэнькі на полік*
*І на ручэнькі дывіться.*

*Ой, ручкі мої біленькі,*
*Чы будэтэ ў свікорка такенькі?"*

Акрамя ўдзелу ў "Вянках", маладыя дзяўчаты фігуравалі таксама ў абрадзе выкупу маладой, а таксама выбіраліся ў якасці дружкі. У другой частцы вяселля галоўная роля належала ўжо прадстаўнікам групы дарослых.

Варта зазначыць, што актыўнасць удзелу дзяўчат у рытуальным і абрадавым жыцці магла прыпыняцца. Як правіла, гэта было ў дні менструацыі. У народнай свядомасці існавала меркаванне, што ў "гэтыя дні" дзяўчына была "нячыстай". Лічылі, што яна знаходзіцца пад уздзеяннем звышнатуральных сіл. Нельга было наведваць царкву, хрысціць дзіця, вянчацца, быць дружкай, цалаваць нябожчыка. Забаранялася камусьці дапамагаць у падрыхтоўцы да святкаванняў: варыць кісель, займацца выпечкай каравая [3, с. 66].

Такім чынам, незамужнія дзяўчаты мелі асаблівы статус у сацыяльнай структуры традыцыйнага сельскага соцыума. На дзяўчат грамадой ускладаліся пэўныя ролі і функцыі, асабліва падчас Тройцы, Купалля, жніва, вяселля. Нягледзячы на распаўсюджванне савецкай масавай культуры, да сярэдзіны XX стагоддзя яшчэ не быў канчаткова знішчаны каляндарна-абрадавы святочны цыкл, да якога былі прывязаны гулянні моладзі. Вёска яшчэ доўгі час заставалася параўнальна ўстойлівым носьбітам традыцыйнай культуры, яе фальклорна-этнаграфічных формаў. З цягам часу старая сістэма абрадаў перастала адлюстроўваць новыя сямейныя і грамадскія адносіны. З развіццём савецкай абрадатворчасці пачалося спрошчванне традыцый. Разам з тым, сямейныя абраднасць заставалася найбольш кансерватыўнай і больш запаволена прыходзіла ў адпаведнасць з новымі ўмовамі грамадска-палітычнага і сацыяльнага жыцця краіны. Яшчэ надоўга ў побыце застаўся дзявочы вечар, на якім па-ранейшаму збіраліся сяброўкі нявесты. Канешне, па форме і зместу гэта было зусім іншае мерапрыемства. У 60-я гг. XX ст. ён уяўляў сабой звычайную вясёлую вечарыну. Натуральны вянок саступіў месца штучнаму вэлюму, які самаручна выраблялі з марлі і дроту, а найчасцей, набывалі ў краме. Такія святы, як Купалле, Тройца, хоць і захоўвалі сваю абрадавую канву, але страцілі першапачатковую рытуальна-міфалагічную базу. З траецкай абраднасці захаваўся толькі звычай ўбіраць хату і двор зелянінай. Развіццё народнай культуры ў 1960-я гг. адбывалася пераважна ў яе другасных формах – фальклярызмах. Арганізоўваліся этнаграфічныя ансамблі, вакальна-інструментальныя, харэаграфічныя калектывы. Песні, якія раней выступалі ў якасці неадʼемнай часткі абрадаў, пачалі бытаваць як звычайныя лірычныя кампазіцыі. Традыцыйным формам культурнага жыцця прыйшла на змену мастацкая самадзейнасць, галоўнай функцыяй якой была забаўляльная. А пры выбары выступоўцаў найменшае значэнне меў статусна-ўзроставы кампанент.

1. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Ф. 6. Воп. 3. Спр. 10.

2. Беларускі народны каляндар / Аўтар-укладальнік А. Ю. Лозка ; Маст. А. І. Дашкевіч. – Мінск : Полымя, 1992. – 205 с.

3. Гугнюк, А. А. Жаночая фізіялогія ў традыцыйных уяўленнях беларусаў (на прыкладзе заходнепалескай вёскі) / А. А. Гугнюк // Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве XIX–XXI стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы : матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі (Гомель, 14 кастрычніка 2021 г.) / рэдкалегія : А. Р. Яшчанка (гал. рэд.) [і інш.] ; М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2021. – С. 64–68.

4. Гурскі, А. І. Чаму вучыць народная песня / А. І. Гурскі. – Мінск : Беларуская навука, 2007. – 192 с.

5. Жук, Н. В. Каляды на Кобрыншчыне / Н. В. Жук // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2002. – С. 492–498.

6. Киркор, А. Литовское Полесье. Белорусское Полесье / А. Киркор // Живописная Россия. – СПб., 1882. – Т. 4. – Ч. 1–2. – 554 с.

7. Кухаронак, Т. І. Летне-восеньскі цыкл каляндарнай абраднасці Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці / Т. Кухаронак // Беларускі фальклор : матэрыялы і даследаванні : зборнік навуковых прац / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. – Вып. 1. – Мінск, 2014. – С. 365 – 377.

8. Ліс, А. С. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў: Сістэма жанраў. Эстэтычны аспект / А. С. Ліс. Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 188 с.

9. Мішына, В. І. Традыцыйная сямейная абраднасць беларусаў : гісторыка-культуралагічны аспект : вучэб.-метад. комплекс для студ. спец. 1-21 03 01 “Гісторыя” / склад. і агульная рэд. В. І. Мішынай. – Наваполацк : ПДУ, 2007. – 220 с.

10. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Драгічынскага раёна ; Я. Я. Аляксейчык і інш. – Мінск : БЕЛТА, 1997. – 575 с.

11. Толстая, С. М. Ритуальные бесчинства молодежи / С. М. Толстая // Славянский и балканский фольклор / Духовная культура Полесья на общеславянском фоне. – М. : «Наука», 1986. – С. 12–14.

12. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т 4. Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2008. – 559 с.

13. Шамякіна, Т. І. Каляндарныя міфы. Знакі вечнасці / Т. І. Шамякіна // Роднае слова. – 1995. – № 1 – С. 56–64.

14. Шепелевич, В. В. Песни деревни Ковнятин Пинского района / В. В. Шепелевич. – Пинск : Паляшук, 2014. – 160 с.

A. Selyakh

**PARTICIPATION OF GIRLS IN THE RITUAL LIFE OF THE VILLAGE OF WESTERN POLESIE IN THE XIX – FIRST HALF OF THE XX CENTURY**

The article is devoted to the consideration of the place and role of girls in the ritual life of a traditional village. The author studies the periods in the annual calendar ritual, which are characterized by the greatest activity of girls. The article emphasizes the special status of unmarried girls in the social structure of the village community. Geographically, the study covers the historical and ethnographic region of Western Polesie. The problem is comprehended through the prism of the memories of the female population, which the researcher collected in rural areas of the Brest region.

УДК [39+365](476.7)

**А. А. Ігнацюк** (БрДУ імя А. С. Пушкіна)
*Навуковы кіраўнік: В. Ю. Піліповіч, старшы выкладчык.*

## ЗАХОДНЕПАЛЕСКАЯ СЯЛЯНСКАЯ ХАТА КАН. 1930-х – ПАЧ. 1950-х гг. ПРАЗ ПРЫЗМУ ВУСНАЙ ГІСТОРЫІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ в. БАЛОТЫ КОБРЫНСКАГА РАЁНА)

*Артыкул прысвечаны рэканструкцыі выгляду заходнепалескай сялянскай хаты канца 1930-х – пачатку 1950-х гг. у кантэксце штодзённага жыцця селяніна на падставе палявых вуснагістарычнах матэрыялаў. Даследаванне планіроўкі хаты, яе знешняга выгляду, інтэр'ера, функцый розных кампанентаў дазваляе лепш вызначыць светапогляд, культурныя нормы, звычаі і традыцыі, якія панавалі на вёсцы ў азначаны перыяд. Выдзяляюцца новыя тэндэнцыі планіроўкі і будаўніцтва хаты, якія паступова набліжаюць вёску да сучаснага выгляду.*

У апошнія дзесяцігоддзі гісторыя штодзённасці стала запатрабаванай і пачала актыўна вывучацца навукоўцамі. Даследаванні штодзённасці далі магчымасць далучыць да навуковага аналізу тыя бакі жыцця простага чалавека, што звычайна заставаліся ў цяні, у тым ліку, праз побыт паглядзець на культурныя нормы, каштоўнасці і матывы чалавека і грамадства ў цэлым. Антрапалагічны паварот ў гістарычнай навуцы даў штуршок гісторыкам звярнуць сваю ўвагу да звычайнага селяніна, да яго свету і асяроддзя. У структуры прасторы штодзённасці хата з'яўляецца значным месцам, дзе праходзяць асноўныя жыццёвыя працэсы чалавека: нараджэнне, дзяцінства, саленне, вяселле, сямейнае жыццё, старасць і г.д. Ацэнка хаты селяніна

Навуковае выданне

# МОЛАДЗЬ БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ

Зборнік навуковых прац
маладых даследчыкаў

Выпуск 11

Галоўны рэдактар *А. А. Савіч*
Камп'ютарная вёрстка *Л. Я. Кірушчава*
Карэктар *Р. М. Усік*

Падпісана да друку 27.12.2023.
Фармат 60x84$^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 9,43. Ул.-выд. арк.9,79.
Тыраж 25 экз. Заказ 7928.

Выдадзена па заказу Студэнцкага навуковага таварыства
УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна»
Б-р Касманаўтаў, 21, 224665, г. Брэст, .
Тэл.: +375(162)219-078, e-mail: moladzbrest@gmail.com

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
прыватнае вытворча-гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства
«Издательство Альтернатива».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/193 от 19.02.2014, № 2/47 от 20.02.2014.
Пр. Машэрава, 75/1, к. 312, 224013, г. Брэст.